**УДК 821.161.3-31.09 (476.5) “18/19”**

# ПОЛАЦК У ТВОРАХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

***д-р філал. навук, праф. В.Ю. БАРОЎКА***
**Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава**

*Пісьменнікі XIX – пачатку XX стагоддзя заклалі асновы мастацкай рэпрэзентацыі Полацка ў новай беларускай літаратуры. Для Я. Баршчэўскага Полацк – значны культурны і асветніцкі цэнтр, для Вайніслава Савіча-Заблоцкага – частка беларускай зямлі з адмысловай прыродай і культурай, для Вацлава Ластоўскага – горад з багатай і слаўнай мінуўшчынай, крыніца беларускай дзяржаўнасці, знакавае месца для суайчыннікаў, увасабленне гістарычнага лёсу Беларусі.*

У кожнай нацыянальнай літаратуры паэтызуюцца свае знакавыя мясціны. Полацк – самы старажытны горад беларускай зямлі, калыска беларускай дзяржаўнасці. Мастацкае рэпрэзентацыя гэтага горада пачалася ў творах новай беларускай літаратуры найперш аўтарамі, чые лёсы былі цесна звязаны з Полацкам і яго ваколіцамі.

Першай грунтоўнай спробай стварэння вобраза Полацка ў новай беларускай літаратуры можна назваць кнігу Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” (1844–1846). Як вядома, з Полацкам у Яна Баршчэўскага былі звязаны ўспаміны пра родныя мясціны, пра юнацтва, пра навучанне ў езуіцкім калегіуме. Адзін з раздзелаў у “Шляхціцы Завальні” меў назву “Полацак”. Вобраз Полацка ў Я.Баршчэўскага непарыўна звязаны з культавай архітэктурай і з адукацыяй. Былы вучань езуіцкага калегіума з замілаваннем успамінаў гады маладосці: “Памятаю цудоўныя вежы горада, які магу назваць родным, сціплую дахоўку святога для мяне будынка, яго доўгія калідоры і прыцемак свечак у вялікім касцеле, і хваласпевы пад яго стракатым скляпеннем, і працяжны гук арганаў, што ўлівае пабожнасць у сэрца. Памятаю пляц, запоўнены людам у час чуллівае працэсіі з абразом Святога Немаўляці, і знаёмае гучанне прыемнае музыкі трубаў з касцельнага ганка; памятаю нашых добрых настаўнікаў і адданых сяброў, высокі вал і мост над ціхаплыннаю рэчкаю…” [1, с. 143]. Культавыя будынкі – характэрныя асаблівасці горада: “Званы св. Стафана, на замкавай гары – царквы св. Сафіі, якія, стоячы ў тумане, здаецца, імкнуцца да воблакаў; іх постаці-веліканы пануюць над горадам і над усёй ваколіцай” [1, с. 140]. Полацк, у мастацкім усведамленні празаіка, мае старажытны радавод: “У ваколіцах Полацка кожная мясціна ў апавяданнях тутэйшых жыхароў мае нейкую гістарычную памятку; на другім беразе Дзвіны за некалькі вёрст адсюль стаіць невялічкі касцёл св. Казіміра; тут, апавядаюць, з’явіўся Казімір перад войскам сваіх суайчыннікаў і перавёў іх праз імклівую рачную плынь; і сёння паказваюць у тым месцы пад Струнем пясчаны падводны вал, па якім пераходзіла войска; царква Барыса і Глеба, нібыта пабудаваная цудоўным чынам самімі святымі; Экіманія – маёнтак паноў Беліковічаў каля самае Дзвіны на стромым беразе ў прыгожай мясціне; увесь горад Полацак відаць адтуль як бы ў чароўнай панараме, а вясною, у паводку, ля падножжа гары чуваць музыка і песні стругаў, што плывуць у Рыгу; шмат таксама старажытных паданняў захоўвае гэта мясцовасць у народных апавяданнях” [1, с. 141]. Засталіся, паводле Баршчэўскага, і ўскосныя напаміны пра язычніцкі перыяд: “За Палатою, на шырокай раўніне, як люстэрка, адбівае сонечнае святло невялічкая плямка вады, якая завецца Валовая азярынаю. Кажуць, што калісьці яна была і ў самім горадзе і да хрышчэння стаялі ля гэтае азярыны святыні Перуна і Бабы Ягі, але цяпер не засталося аніякіх слядоў ад тае старажытнасці” [1, с. 140]. Голас касцельных званоў неадменна вяртаў думку апавядальніка да светлых часоў навучання: “У езуіцкіх школах вакацыі звычайна пачыналіся з першага жніўня; вучняў пасля экзаменаў пераводзілі ў вышэйшыя класы; імёны выдатнікаў друкавалі ў кніжачках дзеля заахвочвання да далейшых поспехаў у вучобе.

Той дзень горад Полацак мог быць сталіцаю ўсёй Белай Русі; шум і грукат вазоў адзываўся па ўсім горадзе; з’язджаліся абывацелі; адны – на ўрачыстасці св. Ігнація Лаёлы; другія – каб падзякаваць за турботы тым, хто даглядаў іхніх дзяцей; іншыя, каб пабыць у тэатры, бо вучні Полацкае акадэміі звычайна да гэтых дзён рыхтавалі пастаноўку; з’язджаліся гандляры з усіх бакоў і найвыгадней збывалі свае тавары” [1, с. 142]. Перад Калядамі таксама адбываліся экзамены і спаборніцтвы, што ажыўлялі існаванне гараджан. Згадваў апавядальнік як бы паміж іншым пра славуты калядны Полацкі кірмаш. Пасля васямнаццацігадовай адсутнасці ў родным краі апавядальніка непрыемна ўразілі змены: “Толькі старажытныя валы, як і раней, зеляняліся травою, і дзве ракі, якія тут зліваюцца, плылі ў тых самых берагах; сям-там на асобных вуліцах закураныя мураванкі і папялішчы нагадвалі пра пажары, што не раз спусташалі гэты горад. Аддаўшыся думкам, я хадзіў па вуліцах нібыта нікому не знаёмы іншаземец; прабіў гадзіннік на вежы – колісь езуіцкага – касцёла, і гэты голас, як прывітанне адданага сябра, закрануў маю душу” [1, с. 140–141]. У навеле “Твардоўскі і яго вучань” сын Завальні сцвярджаў, што, па словах гаспадара кватэры, чарнакніжнік Твардоўскі некалі хадзіў у школу ў Полацку і спакушаў на дрэнныя



PolotskSU

ўчынкі гультаяватых шкаляроў. У аповесці “Драўляны дзядок і кабета Інсекта” мімаходзь успамінаўся Полацк як адукацыйны і гандлёвы цэнтр, згадвалася пра перабудову езуіцкіх муроў.

У 1880-я гады ўраджэнец паўночна-заходняй Віцебшчыны Вайніслаў Савіч-Заблоцкі напісаў аповесць “Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта” з падзагалоўкам “Жаніцьба Ягамосьці пана Шатана Старшага”. Аўтар намагаўся расказаць чытачам пра паўсядзённыя “негістарычныя падзеі” і здарэнні на самай мяжы XVIII і XIX стагоддзяў. Яго Полацк – гэта цэнтр мясцовага шляхецкага жыцця, а самі падзеі аповесці галоўным чынам адбываюцца ў ваколіцах горада з адметнымі прыроднымі ўмовамі і бытавой культурай, што не паўтарала польскую ці рускую. Савіч-Заблоцкі ў адпаведнасці з канцэптуальна абранай назвай твора акцэнтаваў увагу на насельніках полацкіх ваколіц. Апавядальнік даводзіў, што Заходняя Дзвіна і яе насельніцтва заўсёды годна прадстаўлялі Белую Русь. Шляхта полацкіх ваколіц, у паказе пісьменніка, неаднародная па стаўленні да роднага краю, па сваіх маральных імператывах. Патрыятычнае і высокамаральнае крыло шляхты – браты Арлалёты, мечнік. У доме старэйшага з братоў Арлалётаў Януша Паўла шанавалася сваё: гучалі скрыпка, беларуская дуда, гатавалі жжонку і крупнік, успаміналі імёны Врагвлада, Брачыслава, Усяслава, князёўны Рагнеды. Касмапалітычнае і маральна нізкае крыло шляхты – граф Кароль Ульрых Гажагорскі, які цураўся роднага, захапляўся іншаземным, ігнараваў старыя шляхецкія дабрачыннасці. Як бы паміж іншым апавядальнік згадваў пра святога Юзафата – духоўнага патрона Полаччыны, расказваў пра святкаванне Яна ў полацкіх гаях. У аповесці падавалася легенда пра нараджэнне песняроў падчас гэтага святкавання, выказвалася меркаванне пра полацкія карані Баяна, пра адмысловае паходжанне народных песняроў- байкароў: “Бай! – быццам павук праскочыць ён па белай кашулі беларуса, і на кім спыніцца, той будзе Вешчуном-баяром. Вешчуном-Баяром быў старажытны Баян, Баян – вяшчун Полацкі” [2, с. 143].

На пачатку XX стагоддзя Полацк – звычайны невялічкі гарадок Расійскай імперыі, месца, пазбаўленае былой велічы і былога ўплыву на палітычнае жыццё ўсходніх славян. Значным цэнтрам беларускага адраджэнскага руху тады з’яўлялася Вільня. Уяўленне пра беларускі горад найперш асацыявалася з ёй. Вобраз Полацка як фундамента беларускай культуры і дзяржаўнасці на пачатку XX стагоддзя мастацкім словам сцвярджаў Вацлаў Ластоўскі. Для эстэтычнага ўвасаблення сваіх уяўленняў пра горад ён выкарыстоўваў розныя жанры: лірычны верш, апавяданне, аповесць, драматычны абразок. Гістарычны лёс Полацка для Ластоўскага – лёс самой Беларусі. Недвухсэнсоўна гэта даводзілася ў “нашаніўскім” артыкуле 1910 года “Беларускі вечар у Полацку”: “Але спіць край, спіць замершая сталіца і ўвесь беларускі народ…” [3, с. 246]. Полацк для Ластоўскага – былая сталіца, якая на пачатку XX стагоддзя здалёку “выглядае казіста і горда, – вычуваецца нейкая ўкрытая веліч у гэтых руінах, што ляглі, як ранены рыцар, катораму час, быццам птахі-груганы, паскуматалі цела, – ляжыць спакойны, бязмоцны, але гордасць застыгла на абліччы яго, і, ступаючы па целу гэтага веліканa з слаўнай мінуўшчынай, нехаця прыцішаеш голас, каб не збудзіць заснуўшага” [3, с. 245]. Зблізку горад – “драўляныя ліхія дамочкі з пачварнымі стрэхамі, з пакрыўленымі ваконцамі; увесь ён зліваецца ў нейкі шэры, гнойны колер, як бы дагніваючага трупа; кругом вее цішай смерці, толькі дзе-нідзе бліснe купал царквы, манастыра, як абрыўка злоталітага саматкана ў разрытым кургане… Гэта замершы горад. Вымершая сталіца… Направа бачыш з гары дольнага замка бельчыцкія купалы, – гэта даўняя сяліба полацкіх князёў, там стаялі княжацкія харомы, гуляла дружына за цісовымі сталамі, распяваючы багатырскія песні пад звон гусляў, – цяпер колькі старушак-манашак дажываюць свой век у ліхім дамочку” [3, с. 246].

Апавяданне “Разбойнік” (1913) – уласна мастацкая прыступка да стварэння полацкага тэксту, дзе Ластоўскі апяваў старадаўнія часы, Полацк паказваў велічным гандлёвым і дыпламатычным цэнтрам на землях усходніх славян. Ранняе Сярэднявечча рэпрэзентавалася залатым перыядам у гісторыі крывічоў. Аўтар згадваў пра магчымае паходжанне назвы горада: “Мабыць, стаяў ён (камень – *В.Б.*) так і ўзіраўся, калі сюдой варажскі род на маляваных ладдзях пад камандай Полтэса, вікінга-князя, ішоў у сутокі Палоты з Дзвіной, каб заснаваці там тын і зрубаці горад. Памятае ён, мабыць, старога Рагвалода і красуню Рагнеду з вольных дзён. Не раз, мабыць, услухаючыся, лавіў ён гучныя зыкі полацкага вечавога звону ад св. Сафіі і горды гоман вольнага крывічанскага веча. Не раз аб яго аціраліся ладдзі купецкага адважнага люду, што ішлі, нагружаныя воскам, мёдам ды несчысленымі саракамі кунічымі і бабровымі, у Рыгу, і на кгоцкі бераг, і к хамаву племю з паклонамі ад Крывічанскае зямлі, і полацкага вольнага веча, і ад залатога княжацкага пасада, і яго вернай дружыны – русі, просячы на замену гартоўных мячоў, кованага срэбра, золата і самацветаў” [3 с. 144]. Часы Сярэднявечча – трывожныя і разам з тым самыя плённыя для горада: “Дно Дзвіны золатам цякло, а берагі серабром былі мошчаны. А рубяжы адкрыты, і паміж князёў не было праўды. І чужацкія рукі выцягваліся па золата і па волю крывічанскую. Не раз Дзвіна мутна цякла, ускаламучаная капытамі літоўскіх коней. Прыходзілі яны ў багатую старонку, як мядзведзь да борці, і дзерлі скрылі залацістага мёду і душылі пчол. Не раз працавітыя пчолкі нанова выцягівалі вузу і налівалі соты, але бывала, што ўпадаў і гнілец у борць… Тады разляталіся пчолкі. А Дзвіною снавалі, як павукі, людзі з абасечанымі, двуручнымі мячамі ў чорных бурносах з нямецкім белым крыжом і апутывалі павучынай старонку, а па павучыні той паўзла “ганзіятыцкая” арава…”

[3, с. 144]. Адмыслова згадваў апавядальнік пра Барысавы камяні: "На грудзях у Разбойніка (каменя – *В.Б.*) шчэрбы і равочкі кругам раскінуліся, а пасярод схімніцкі крыж. Гэта па смерці Барыса, Гінвілавага сына, на спамін па душы яго, з блізкай баровай пустэльні, што была на пясчыстым узгорку па той бок Дзісенкі, сівы мніх, прывёўшы каменаклёва, загадаў высеч, каб кожны, хто паедзе міма Дзвіной, уздыхнуў, да Бога кажучы: "Помозі, Божэ, рабу твоему князю Борысу…". Цяпер гэтыя пісьмёны злізаны раз'ятранай Дзвіной, і ніклы толькі след двох-трох літар віднее…" [3, с. 144]. Аўтар стварыў свой аповед пра Барысавы камяні як манументальны помнік эпіграфікі XII стагоддзя. Вядома, што чатыры вялікія валуны з высечанымі на іх шасціканцовымі крыжамі знаходзіліся ў рэчышчы Заходняй Дзвіны ніжэй Полацка. З гэтых камянёў захаваўся адзін, які знаходзіўся каля вёскі Падкасцельцы ў пяці кіламетрах ад Полацка. Князя Барыса аўтар называе Гінвілавым сынам. У гісторыі вядомы Барыс Брачыслававіч, полацкі князь, унук Усяслава Брачыслававіча. Ён памёр у 1128 годзе. Надпісы на Барысавых камянях звязваюць менавіта з ім. Відаць, В.Ластоўскі быў знаёмы з тэкстам "Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага", дзе гаварылася пра князя Мінгайлу, яго сына Гінвіла, пра Гінвілавага сына Барыса, які заснаваў горад Барысаў, пабудаваў храмы святой Сафіі, святога Спаса, жаночы манастыр, царкву ў Бельчыцах. Верагодна, што менавіта гэты князь Барыс фалькларызаваўся ў творы "Князь Барыс і чорт" (1923): "Князь Барыс мураваў у Полацку царкву і, ну, ведама, – гэткая будыніна! – запазычыўся і задаўжаўся кругом. Няма ўжо больш дзе пазычаць! Дык пайшоў урэшце да чорта і папрасіў у яго грошы, кажучы, што на вайну патрэбна. На нішто добрае чорт, ведама, не дасць, але на вайну – пазычыў" [3, с. 163]. Князь-дойлід паказваўся Ластоўскім дасціпным і спрактыкаваным правіцелем, заклапочаным будучыняй роднай зямлі.

У працэсе рэпрэзентацыі знакавых мясцін і асоб В.Ластоўскі нярэдка звяртаўся да адвольнага вытлумачэння гістарычных фактаў. Яго апавяданне "Разбойнік" у жанравым плане – літаратурная апрацоўка легендаў пра Полацк і полацкую зямлю. Аўтар гранічна свабодна абыходзіўся з гістарычным матэрыялам, калі расказваў пра падарожжа Еўфрасінні Полацкай у Святую зямлю: "Раным-рана зазванілі ў святой Сафіі, у арліным гняздзе на полацкім замку. Адклікнуліся ім званы ў Спаса і з княжай Сялецкай сялібы. Паваліў народ на замак да святой Сафіі – сумны, невясёлы.

Чаго ж зажурыліся палачане? Ці вораг непашчадны з цёмных пушч літоўскіх хлынуў, ці слабоды смаленскія ўзбунтаваліся, ці Ольгавічы на Рагваложых унукаў паднялі меч? Не вораг нахлынуў, і слабоды смаленскія пад ласкавым ды набожным князем у послуху, і Ольгавы ўнукі не паднялі мяча на Рагвалодавічаў, а дачка князева Прадслава з сястрой і братам выязджаюць у далёкую старонку на паклон да гроба Хрыстовага.

Ужо ладдзі выразаныя, пазлачаныя стаяць пры беразе і трыццаць малайцоў-грабцоў сядзяць пры ясянёвых тачоных вёслах, і белыя парусы, як лебедзі, выгнулі грудзі.

Пасыпалі палачане дарогу княжне Прадславе і сястры яе і брату Давіду чарнобыллем-зеллем, багаткамі пушнымі і шматфарбнымі кволымі краскамі ад св. Сафіі да каванага мосту і ад мосту да берага. Благаславіў уладыка і бацька-князь з княгіняю сесці ў ладдзю, ехаць у далёкую дарогу" [3, с. 145]. Еўфрасіння Полацкая, як вядома, адправілася ў падарожжа ў канцы свайго жыцця, менавіта Еўфрасінняй, а не Прадславай, бо Прадслава – яе свецкае імя, з якім яна развіталася пасля пострыгу.

Падчас Першай сусветнай вайны В.Ластоўкі напісаў шэраг твораў, заснаваных на гістарычным матэрыяле, якія склалі цыкл "Беларуская мінуўшчына". У апавяданні "Князёўна Рагнеда" (1916) акцэнтавалася значнасць Полацка ў палітычным жыцці Сярэднявечча: "Тысячу з лішнім гадоў таму жыў у Полацку, на той час сталічным месце ўсёй Беларусі, князь Рагвалод. У Рагвалода былі два сыны і дачка Рагнеда. Рагнеда была вельмі гожая князёўна. Многа княжэвічаў з суседніх старонак пасылалі сваіх сватоў у Полацк, просячы рукі гожай князёўны" [3, с. 149]. Уладзіміра, магчыма, каб надаць большую палітычную вагу Полацкаму княству, апавядальнік называе кіеўскім князем, хаця на момант сватання ён правіў у Ноўгарадзе. В.Ластоўскі акцэнтаваў два вобразы як рэпрэзентанты крывічанак: свабодалюбівай і непакорнай Рагнеды ды мудрай і богабаязнай Еўфрасінні. У апавяданні "Усяслаў" (1916) Ластоўскі апрацаваў паданні пра гэтага князя: "Усяслаў быў сынам Братаслава, а праўнукам Рагнеды. Яшчэ перад нараджэннем Усяслава да княгіні, маці яго, прыйшлі варажбіты-старцы і сказалі, што яна народзіць сына, каторы праслыве адвагай і мудрасцю далёка па свеце. Калі нарадзіўся Усяслаў, бабкі, купаючы князевіча, убачылі ў яго на патыліцы радзімы знак у кшталце звязды і месяца. Прызваныя на князёўскі двор варажбіты сказалі, што гэтыя знакі на патыліцы князевіча значаць, што ён будзе мець надпрыродную сілу, але іх трэба хаваць ад людскога вока. Дзеля гэтага князь Усяслаў усё сваё жыццё насіў на галаве павязку" [3, с. 151]. Князь Усяслаў у паказе Ластоўскага – асоба, надзеленая надзвычайнымі ўласцівасцямі: "Людзі забабонныя расказвалі, што князь Усяслаў перакідаецца ў ваўка і ноччу абягае свае і суседнія княствы і бачыць усё, што і як робіцца, што вочы яго праз найтаўсцейшыя сцены бачаць і вушамі ён за соткі міль кожны голас чуе. Княжыў Усяслаў 87 гадоў, памёр у 1101 гаду" [3, с. 151]. Насамрэч жа, як сцвярджаюць гістарычныя крыніцы, Усяслаў княжыў у Полацку 57 гадоў з перапынкамі.

Ідэяй дынамікі гістарычнага працэсу, зменай афарбоўкі светапоглядных установак землякоў пад уплывам часу быў прасякнуты верш В.Ластоўскага “Дума на Полацкім замчышчы” (1923): “Цьмы-цьмоў і процьмы лет // на гэтым капішчы канодным, // складалі Дзеве чэсць.// Дзевін зваўся грод, // і Дзевіна рака ў стоп яго ручэла, // бажніца Дзеве ў чэсць // на сонцы дахам снела, // здобячы сабой накоп. // У бажніцы ж, перад Дзевы стодам, // хадзілі дзевы карагодам // ў кудзебны тан. // Святарны хор пявежнай мовай // магутаў племені ўслаўляў. // Збіраліс старцы тут // на раду й суд” [3, с. 208]. Аднак “лад пітомны // разбурыў крыжа знак”, месца язычніцкіх багоў занялі хрысціянскія: “у почце грэчаскіх святых // засела Софас, // мясцовую сабой // зміняючы Паладу” [3, с. 208]. Пасля няўдалай спробы звярнуць увагу еўрапейскіх палітыкаў на лёс Беларусі на Генуэзскай канферэнцыі В.Ластоўскі напісаў верш “Генуэзскі рынак” (1923), у якім абвінаваціў еўрапейскіх палітыкаў у пастаянным патуранні рабству. У ліку першых рабоў, з працы якіх квітнела Генуя, ён назваў гордых і непакорных жыхароў Полацка, некалі заваяваных князем Уладзімірам. Першым у беларускай літаратуры Ластоўскі характарызаваў старажытны горад праз выдатных асветнікаў Еўфрасінню Полацкую і Францыска Скарыну. Драматычны абразок “Адзінокі” (1923) меў падзагаловак “Эпізод з жыцця Францішка Скарыны”. Аўтар згадваў пра віленскія старонкі жыцця першадрукара, акцэнтаваў духоўнае адзіноцтва чалавека глыбокага розуму і высокіх памкненняў у асяроддзі прагматыкаў і ваяўнічых невукаў.

Кульмінацыйным момантам у стварэнні Ластоўскім полацкага тэксту стала аповесць з метафарычнай назвай “Лабірынты” (1923). Апавядальнік на самым пачатку прызнаваўся, што яго як аматара старасвеччыны даўно прываблівала “сівагорбы Полацак”. Самы старажытны беларускі горад прадстаўляў таямнічым месцам, дзе апавядальнік сустрэўся з храналагічным парадоксам, бо час для яго асабіста спыніўся, а для іншых людзей доўжыўся натуральна. Характэрна, што апавядальнік па сюжэце твора прыязджае з Вільні як адраджэнскага цэнтра ў праслаўлены перыяду Сярэднявечча горад, які быў некалі цэнтрам аб’яднання ўсходнеславянскіх зямель і актыўнага супраціву знешнім ворагам. Сімволіка сюжэтнай лініі ў аповесці дастаткова празрыстая: беларускае адраджэнне павінна грунтавацца на трывалай аснове гістарычнага досведу і на асвеце. Полацкая інтэлігенцыя, прадстаўленая настаўніцтвам, чынавенствам, дваранствам і месцічамі, па-свойму захоўвае гістарычную памяць. Археолаг-аматар Іван Іванавіч узначальваў гурток прыхільнікаў даўніны – “Археалагічную вольную контрфратэрнію”. Мінулае Полацка натхніла абруселага немца-чыноўніка збіраць матэрыялы па гісторыі краю. Акалічны памешчык цікавіўся дэманалогіяй, хоць яго бацька сябраваў з манахамі-васільянамі. Мешчанін Грыгор Н., маўклівы старац па мянушцы “Падземны чалавек”, захапляўся легендамі пра падземныя хады і схаваныя там дзівы. Мясцовы настаўнік цікавіўся старажытнай язычніцкай культурай. Дзейнасць “Археалагічнай вольнай контрфратэрніі” спрыяла захаванню гістарычнай памяці. Падземны чалавек нагадваў пра Богінскае возера, пра паўвостраў Богіна са знакамітымі некалі бажніцамі. Возера і паўвостраў – сведчанне старадаўнасці горада: “У канцы возера ідуць валатоўкі бронзавага веку, на пяшчыстым урочышчы” [3, с. 52]. Полацк для Ластоўскага – горад таямніц, а гарадскія лёхі – іх захавальнікі. Ластоўскі першым у беларускай літаратуры загаварыў пра полацкую бібліятэку і яе загадкавы лёс. Пафас “Лабірынтаў” зводзіўся да сцвярджэння паўнавартаснасці і старадаўнасці беларускай культуры, складанасці шляхоў нацыянальнай самасвядомасці.

Пісьменнікі XIX – пачатку XX стагоддзя заклалі асновы мастацкай рэпрэзентацыі Полацка ў беларускай літаратуры, у працэсе якой выявілі свае грамадскія прыярытэты, разуменне гістарычнага працэсу, ролю асветы і гістарычнай памяці для асобнага чалавека і для народа. Для Яна Баршчэўскага Полацк – значны культурны і асветніцкі цэнтр, для Вайніслава Савіча-Заблоцкага – частка беларускай зямлі з адмысловай прыродай і культурай, для Вацлава Ластоўскага – горад з багатай і слаўнай мінуўшчынай, крыніца беларускай дзяржаўнасці, знакавае месца для суайчыннікаў, увасабленне гістарычнага лёсу Беларусі.

ЛІТАРАТУРА


1. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.
2. Савіч-Заблоцкі, В. Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта / В. Савіч-Заблоцкі // Полымя. – 2004. – № 4. – С. 134–159.
3. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1997. – 512 с.


**POLOTSK IN THE WORKS OF BELARUSIANS WRITERS OF THE XIX – EARLY XX CENTURY**

***V. BOROVKA***

*The writers of the XIX – early XX century laid the foundations of artistic representation of Polotsk in the new Belarusian literature. For Y. Borshevsky Polotsk is a significant cultural and educational center, for V. Savic-Zablotskyy is part of Belarusian land with great nature and culture, for V. Lastovsky is a city with a rich and glorious past, the source of the Belarusian statehood, a symbolic place for compatriots, the embodiment historical destiny of Belarus.*